ПАДЗЕЯ

# ПАМЯЦІ БАЛЮЧЫЯ РАДКІ

**Да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа пісьменнікі Гродзеншчыны прымеркавалі чарговую прэзентацыю зборнікаў літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мерапрыемства пад назвай «Старонкі памяці і славы» 19 чэрвеня адбылося ў Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А. Макаёнка.**




Па ўстановах культуры горада над Нёманам працягваюць сваё шэсце паэтычны зборнік «Память огненных лет» (2025); зборнік прозы і публіцыстыкі «Поле памяти» (2025), а таксама зборнік літаратурных твораў «Памяти вечный огонь» (2024), прымеркаваны да 80-годдзя Вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нагадаем, што з'яўленне гэтых кніг стала магчымым дзякуючы супрацоўніцтву Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі з гарадскім і абласным Саветамі ветэранаў г. Гродна. Як і ва ўсіх кніг, цяпер у жыцці гэтых выданняў наступіў важны перыяд сацыялізацыі, здабыцця свайго месца пад сонцам, а дакладней, свайго чытача. Наколькі шчаслівым будзе лёс нашых кніг пра вайну і Перамогу, пакажа час. 20 мая адбылася прэзентацыя дадзеных калектыўных выданняў у

Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага. І вось праз месяц новыя кнігі разам са сваімі аўтарамі і рэдактарамі прыйшлі ў галоўную бібліятэку горада.



Прадстаўнікі ўсіх гарадскіх бібліятэк, сапраўдныя знатакі мастацкага слова, чытачы рознага ўзросту, літаратары, педагогі сабраліся ў невялікай, утульнай чытальнай зале. Трэба адзначыць, што тут рэгулярна праходзяць літаратурныя мерапрыемствы – прэзентацыі кніг, лекцыі; адзначаюцца юбілеі вядомых майстроў слова. У ліку гэтых культурных падзей і мерапрыемствы Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Напрыклад, у мінулым годзе мы зладзілі тут фінальны этап абласнога семінару маладых літаратараў Гродзеншчыны. Спрыяльная атмасфера, створаная калектывам бібліятэкі пад кіраўніцтвам дырэктара Дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» Кацярыны Раманаўны Расіцан, натхняе і настройвае на творчы лад. Калі з залы на вас пазіраюць зацікаўленыя вочы публікі, а з паліц – вокладкі вашых кніг, хочацца напоўніць асобым, каштоўным сэнсам сваё з'яўленне ў гэтым месцы. Яшчэ тутэйшую атмасферу можна параўнаць з духам вялікай, дружнай сям'і. Да гасцей тут ставяцца вельмі прыязна, як да родных.




Адкрыла мерапрыемства даўні сябар нашай пісьменніцкай арганізацыі, бібліятэкар Іна Арсеньеўна Прасолава, якая пазнаёміла з гісторыяй выдання ў Гродне калектыўных зборнікаў да юбілеяў Перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне. …Вядучы мерапрыемства, рэдактар кніг, член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык падкрэсліў: «Памяць аб'ядноўвае людзей. Сімвалічна, што кнігі пра Перамогу стварае арганізацыя, у назве якой на першым месцы стаіць слова «Саюз», сугучнае да імя Радзімы многіх з нас, вялікай, адзінай краіны, якая перамагла фашызм. У назвах усіх трох кніг прысутнічае слова «памяць». Пакуль мы памятаем пра мінулае, гартаем яго трагічныя і гераічныя старонкі, у нас ёсць будучыня». …Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры

Рэспублікі Беларусь, паэтэса, празаік Людміла Антонаўна Кебіч, рэдактар кніг, распавяла пра тое, як яны нараджаліся, чым характарызуюцца іх жанравы, ідэйна-тэматычны змест і аўтарскі склад. Затым прагучалі вершы Людмілы Антонаўны з кнігі «Память огненных лет». …З творамі ваенна-патрыятычнай лірыкі і прозы, з успамінамі пра герояў і ўдзельнікаў вайны выступілі члены СПБ, паэтэсы з Гродна Людміла Шаўчэнка і Кацярына Каламійцава; аўтар нарысаў, аматар літаратуры Вольга Дзіканава; член СПБ, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур (Скідзель); аўтар некалькіх кніг, краязнавец, публіцыст Міхаіл Маскальчук (Бераставіца); лаўрэат шматлікіх літаратурных конкурсаў, кандыдат у шэрагі СПБ, паэтэса Вольга Алізар; аўтар 11 кніг, кандыдат у шэрагі СПБ, празаік Ірына Салата; загадчык бібліятэкі гімназіі № 6, паэтэса, празаік Юлія Чамярыс; член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея» Святлана Глембоцкая. Сведчаннем насычанасці нашага літаратурнага жыцця сталі экспромты – прэзентацыі іншых кніг удзельнікаў сустрэчы. Тамара Мазур прадэманстравала сігнальны экзэмпляр сваёй кнігі лірычных прысвячэнняў гораду-спадарожніку Скідзелю. Член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая прэзентавала міжнародны зборнік паэзіі і прозы «Памяти павших во имя живых» (Нясвіж). Прысутныя пазнаёміліся з кнігай франтавіка Івана Іванавіча Міціна – аповесцю пра вайну «Гартаючы старонкі памяці». Ужо не пры жыцці ветэрана кніга была выдадзена ўнучкай аўтара Юліяй Чамярыс і яе дачкой Дзіянай. І зноў гучыць слова «памяць»… Што за ім у свеце сучаснай літаратуры Прынёмання? Максімальная грамадская актыўнасць, увасобленыя ў слове грамадзянскае сумленне, прага міру і шчаслівай будучыні, слава пераможцам той жудаснай вайны, вялікая праца сапраўдных патрыётаў, адданых сваёй Радзіме творчых людзей. Тамара Мазур, Міхаіл Маскальчук і Вольга Дзіканава падарылі бібліятэцы свае індывідуальныя выданні. Памяць ахвяр і герояў Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнікі сустрэчы ўшанавалі хвілінай маўчання. Са старонак зборнікаў, з літаратурных радкоў у залу накіроўваліся моцныя патокі шчырых чалавечых пачуццяў. Мерапрыемства атрымалася сапраўдным святам кранальнай пачуццёвасці. Святам са слязамі на вачах.




У фінале імпрэзы прадстаўленыя кнігі «Память огненных лет», «Поле памяти» і «Памяти вечный огонь» былі ўручаны галоўнай бібліятэцы горада над Нёманам. Прэзентацыі выдадзеных да 80-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне калектыўных літаратурных зборнікаў сучасных прынёманскіх аўтараў у Гродне і Гродзенскай вобласці працягваюцца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** удзельнікі і незабыўныя моманты прэзентацыі зборнікаў літаратурна-мастацкіх твораў сучасных літаратараў Прынёмання, прысвечаных 80-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Гродзенская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. Макаёнка. 19 чэрвеня 2025 года.





Вядучы імпрэзы Д. М. Радзівончык




Бібліятэкар І. А. Прасолава







Слова старшыні ГрАА СПБ Л. А. Кебіч




Гучаць вершы са зборніка «Памяти вечный огонь»




Выступае член СПБ, паэтэса Людміла Шаўчэнка




Гучаць вершы са зборніка «Память огненных лет»





Член СПБ, паэтэса Кацярына Каламійцава (ваенна-патрыятычная лірыка з кнігі «Памяти вечный огонь»)




Вольга Дзіканава: нарыс са зборніка прозы і публіцыстыкі «Поле памяти»




Член СПБ, паэтэса Тамара Мазур выступіла з паэзіяй са зборніка «Память огненных лет» і прыадчыніла сакрэты сваёй творчай лабараторыі






Госць з гарадского пасёлка Бераставіца, даследчык гісторыі Вялікай Айчыннай вайны,
краязнавец Міхаіл Маскальчук прадставіў сваю творчасць, з якой можна пазнаёміцца ў кнізе «Поле памяти»




Лаўрэат шматлікіх рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў, паэтэса Вольга Алізар прадэкламавала вершы з кнігі «Память огненных лет»




Празаік Ірына Салата прачытала сваё апавяданне «Куля ў сцяне» (кніга «Памяти вечный огонь»)




Паэзія і проза Юліі Чамярыс прадстаўлены ў кнігах «Память огненных лет» і «Поле памяти». Пісьменніца таксама паказала кнігу свайго дзеда-франтавіка «Листая страницы памяти», якую выдала разам з дачкой Дзіянай



Юлія і Дзіяна Чамярыс






Член СПБ, паэт Дзмітрый Радзівончык выступіў з кнігай «Память огненных лет» 2020 года




Член Гродзенскага гарадскога літаб’яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая з кнігай «Памяти павших во имя живых» (Нясвіж)






Сваімі ўражаннямі ад мерапрыемства падзялілася дырэктар Дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» К. Р. Расіцан






Прадстаўленыя грамадскасці кнігі пісьменніцкай арганізацыяй уручаюцца бібліятэцы


СТАРОНКІ
ПАМЯЦІ І






**Фота** Анатоля Апанасевіча
і Юліі Хільман

ЦБС г.Гродно